# в. Абухава

Рагонскага раёна, Сакалішчанскага с/с

Уезд у вёску з заходу

| справа (улік сем'яў) | злева |
|---|---|
| 1. Маторавы (3 чалавекі) | 12. Парадні (4) |
| 2. Дайлідавы (3) | 13. Ясючэнкі (3) |
| 3. Марозава (1) | 14. Якубоўская (9) |
| 4. Дайлідавы (3) | 15. Яршовы (9) |
| 5. Марозавы (3) | 16. Пісарэнкі (3) |
| 6. Машаравы (3) | 17. Марозавы (7) |
| 7,8. Марозавы (2 сям'і, 6 чал.) | 18. Осіпавы (5) |
| 9. Казадоевы (4) | 19. Марозавы (5) |
| 10. Красоўскія (4) | 20. Жукі (4) |
| 11 Карніленкі (4) | 21. Марозавы (3) |
| | 22. Марозавы (8) |
| | 23. Дзеліжонкі (5) |
| | 24. Юльчонкі (2) |

браты, вясковая мянушка, прозвішча не ведаю, жылі ў лазні.

У вёску Абухава ўваходзілі таксама 6 не-сселеных блізкіх хутароў: Дайлідава Рыгора (3), Дайлідавай Лізаветы (3), Марозавых Васіля і яго сына Ївана (2 сям'і, 6 чалавек), Марозава Пятра (3), Платонавай Палагеі (4), Абуховічаў (2). Большасць сселеных у 1939-40 гадах двароў не мелі самастойных гаспадарчых пабудоў, якія не былі перавезены. Амаль не было садоў. Людзі супраціўляліся перасяленню. У большасці на гэта не было ні сіл, ні сродкаў.

У 1941 годзе на пачатак вайны ў вёсцы Абухава была 31 сям'я, 28 дамоў.

Вёска Абужава з'ўляецца цэнтрам калгаса „2-я пяцігодка". Сакалішчанскага сельсавета Расонскага раёна. Членамі гэтага калгаса былі такама жыхары аддаленых хутароў Шкорнева (Лаўрэновічы, Аўласёнкі), Гаравыя (Марозавы, Скуратавы), Снякова (2 сям'і Васілеўскіх).

Усяго ў калгасе „2-я пяцігодка было 37 сем'яў.

Нямецкія фашысты ўвайшлі ў вёску Абухава ў першыя-ж дні вайны, без бою, нас ніхто не абараняў. Спалілі пчол, забралі з камода сямейныя скарбы. Прыязджалі яшчэ тыдні праз 3, збіралі прадукты, прызначылі старасту. Партызаны, а гэта былі акружэнцы, праз дзень яго расстралялі. Далей у 1941, 1942 і да снежня 1943 мы жылі пад абаронай партызан, немцаў не бачылі. У жніўні 1941 вяскоўцы з партызанамі ездзілі ў Паляўшчыну (бязлесая мясцовасць пад Дрысай) убіраць збожжа. На другі дзень з'явіліся немцы, у баі 2 партызаны былі паранены.

У вёсцы заўсёды былі партызаны. Адны вярталіся, другія ішлі на заданні. Прыходзілі стомленыя, галодныя. Часта суткамі палілася печ, каб зварыць бульбы ці спячы якіх бліноў, а зімой абсушыцца. У час рэйкавай вайны мы з партызанамі ездзілі разбіраць аднакалейку Полацк — Себеж (?). Мужчыны развінчвалі і расцягвалі рэйкі, жанчыны зносілі шпалы.

У вёсцы было шмат бежанцаў. У нас жыла Марыя Александроўская з 4 дзецьмі з вёскі Росіца каля Дрысы.
У 1943 карныя экспедыцыі фашыстаў узмацніліся. Партызанам усё цяжэй было стрымліваць іх націск. Давялося хавацца ў лесе. Наша сям'я разам з 9 іншымі сем'ямі пабудавалі зімовы лагер у 4-х кіламетрах ад вёскі ў балоцістым лесе на выспе, мясцовая назва Смалаўкі.
Калі 20 снежня 1943 года фашысты для барацьбы з партызанамі знялі войскі з фронту падпольныя партыйныя органы і камандаванне партызанскіх брыгад прынялі рашэнне прарваць блакаду і вывесці людзей за лінію фронту. 27 снежня партызаны сказалі людзям к вечару сабрацца ў дарогу ўсім, хто можа ісці. Мама угаварыла мяне пайсці, а яны схавалюцца ў Смалаўках.
Усё далейшае я ведаю са слоў бежанкі Марыі Александроўскай, якая з маёй сям'ёй была ў Смалаўках. 30 снежня хтосьці пусціў чутку, што карнікі ідуць па вялікіх лясах. Таму трэба вярнуцца ў невялікі лясок каля вёскі і перачакаць. Ноччу на 31 снежня амаль усе з лагера перабраліся ў лясок, які і без таго быў поўны людзей, што не змаглі пайсці за фронт.

Раніцай 31 снежня карнікі – 16 паліцаяў і 2 немцы з сабакам па свежых слядах знайшлі прыехаўших. Пачаўся плач дзяцей і жанчын, крыкі фашыстаў. Людзям загадалі пастроіцца. Калі Іван Якубоўскі (інвалід 1-й сусветнай вайны) з 8-гадовым сынам і Ганна Васілеўская з чадавалым хлопчыкам на руках кінуліся ўцякаць, некалькі карнікаў з сабакам дагналі іх на хутары Шкорнева і забілі. Александроўская, скарыстаўшы мітусню, схавалася за куст ядлоўцу, хоця яе чацвёра дзяцей засталіся ў шарэнзе. Фашысты чыталі прыгавор на нямецкай мове, часта паўтараючы слова „партызан". Былі расстраляны ўсе 30 прыехаўших вяскоўцаў, з іх 14 дзяцей, а таксама людзі, што знаходзіліся ў лясочку.

Днём 31 снежня 1943 года фашысты спалілі вёску Абухава, у лесе забілі вялікую сям'ю Яршовых, жывымі спалілі ў пуні на хутары Ажарышчы сям'ю Карніленкаў і ўсіх хто там хаваўся.

Са слоў Хрысціны Марозавай і Ульі Осіпава хавалі забітых толькі ў красавіку 1944 года, калі растаяла зямля, каб выкапаць магілу. Паклалі ў 3 рады больш за 30 чалавек. У 1982 годзе на магіле пастаўлены помнік, зроблена металічная агародка. Здымак

гэтага помніка ахвярам фашызму
№ 2056 ёсць у кнізе „Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць" на старонцы 386.

Я вярнулася дамоў адразу пасля выгнання фашыстаў, у першай палове ліпеня 1944 года. Вёска была спалена цалкам, не было людзей. Праз 5—10 гадоў пабудаваліся Дзмітрый Ясючэнка, Платон Дайлідаў, Аляксандр Жук, але жыць тут не змаглі. Апошняя сталая жыхарка Абухава Хрысціня Марозава памерла гадоў 10 таму. Тэрыторыя вёскі даўно зарасла лесам, а помнік (агароджу) яшчэ ў мінулым стагоддзі пачалі ламаць. Сама па стану здароўя ездзіць туды не магу. Не раз пісала ў Расонскі райвыканкам і прасіла арганізаваць шэфства над магілай і помнікам ахвяр фашызму — адказу няма. Мне 85. Пішу не па адрасу, а ад горычы, ад свайго бяссілля. Прабачце.

Алена Марозава.

10.6.2013.